ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
29.07.2025 № 134

# Вучэбная праграма
## па вучэбным прадмеце «Замежная мова» (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская) для III–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Замежная мова» (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская) (далей – вучэбная праграма) прызначана для III–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 105 вучэбных гадзін у III класе (3 вучэбныя гадзіны на тыдзень) і 105 вучэбных гадзін у IV класе (3 вучэбныя гадзіны на тыдзень).

3. Генеральная мэта навучання замежнай мове заключаецца ў фарміраванні вучняў як суб'ектаў міжкультурнай камунікацыі праз авалоданне імі іншамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыяй і развіццё ў іх якасцей полікультурнай асобы, запатрабаваных сучасным інфармацыйным грамадствам ва ўмовах глабалізацыі. Генеральная мэта прадугледжвае пастаноўку і рэалізацыю адукацыйных, развіццёвых і выхаваўчых мэт у іх адзінстве.

Адукацыйныя мэты: моўнае і маўленчае развіццё асобы вучня шляхам забеспячэння практычнага валодання замежнай мовай як эфектыўным сродкам зносін у адзінстве яе кагнітыўнай, камунікатыўнай і экспрэсіўнай функцый; засваенне і актуалізацыя ведаў аб вывучаемай замежнай мове; авалоданне навыкамі і ўменнямі іншамоўнай маўленчай дзейнасці (успрыманне і разуменне маўлення на слых, гаварэнне, чытанне, пісьмовае маўленне).

Развіццёвыя мэты: кагнітыўнае, камунікатыўнае, сацыякультурнае развіццё вучняў; авалоданне спосабамі фарміравання і фармулявання думкі на замежнай мове; развіццё лінгвістычнага кампанента гуманітарнага мыслення; узбагачэнне эмацыянальна-пачуццёвай сферы асобы.

Выхаваўчыя мэты: узбагачэнне духоўнага свету вучняў; фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый, грамадзянскасці і патрыятызму; выхаванне павагі да культуры і народа іншай краіны; фарміраванне псіхалагічнай гатоўнасці да міжкультурнай камунікацыі, уменняў ажыццяўляць зносіны ў кантэксце дыялогу культур.

4. Задачы навучання замежнай мове:

фарміраванне ўяўленняў аб замежнай мове як сродку зносін;

засваенне лінгвістычных ведаў, даступных і неабходных для авалодання вусным і пісьмовым маўленнем на замежнай мове на элементарным узроўні;

фарміраванне некаторых універсальных лінгвістычных паняццяў (гук, літара, слова, сказ, часціны мовы, інтанацыя), якія назіраюцца ў роднай і замежнай мовах;

фарміраванне элементарных камунікатыўных уменняў гаварэння, успрымання і разумення маўлення на слых, чытання, пісьмовага маўлення на замежнай мове з улікам маўленчых магчымасцей і інтарэсаў вучняў;

развіццё ўвагі, мыслення, памяці і ўяўлення ў працэсе ўдзелу ў мадэляваных сітуацыях зносін;

далучэнне да новага сацыяльнага (сацыякультурнага) досведу з выкарыстаннем замежнай мовы;

развіццё кагнітыўных, вучэбных і творчых здольнасцей вучняў сродкамі замежнай мовы;

сацыякультурнае развіццё асобы; супастаўленне вывучаемай мовы з роднай і культуры гэтай мовы з нацыянальнай; фарміраванне ўменняў прадстаўляць сваю краіну і культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін;

развіццё матывацыі да вывучэння замежнай мовы праз фарміраванне патрэб лепш разумець навакольны свет і быць зразуметым ім;

развіццё самаадукацыйнага патэнцыялу вучняў, забеспячэнне іх гатоўнасці да самастойнай работы над мовай, у тым ліку авалоданне неабходнымі тэхнікамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, стратэгіямі самааналізу, саманазірання.

5. Метады і формы навучання і выхавання.

У сваёй сукупнасці мэты і задачы прадугледжваюць праектаванне і арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове патрабаванняў асобасна арыентаванага, кампетэнтнаснага, камунікатыўнага, кагнітыўнага і сацыякультурнага падыходаў у іх адзінстве.

Канструяванне працэсу навучання патрабуе выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій (сацыяльных, інфармацыйна-камунікацыйных і іншых). На вучэбных занятках неабходна мадэляваць сітуацыі міжкультурных зносін, актыўна прымяняць метады праблемнага навучання і эўрыстычныя метады, выкарыстоўваць розныя формы работы (парныя, групавыя, індывідуальныя і іншыя формы работы).

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца на аснове мэт і задач вывучэння канкрэтнай тэмы, асноўных патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, сфармуляваных у дадзенай вучэбнай праграме.

6. Чаканыя вынікі засваення дадзенай вучэбнай праграмы.

Прадметныя вынікі:

авалоданне пачатковымі ўяўленнямі аб нормах замежнай мовы (фанетычных, лексічных, граматычных);

фарміраванне ўменняў размаўляць на замежнай мове на элементарным узроўні з улікам маўленчых магчымасцей і патрэб вучняў у

вуснай (успрыманне і разуменне маўлення на слых, гаварэнне) і пісьмовай (чытанне, пісьмовае маўленне) формах;

аваладанне сацыякультурнымі ведамі: назвы асноўных краін вывучаемай мовы, асобныя фрагменты твораў дзіцячага фальклору краіны вывучаемай мовы;

аваладанне сацыякультурнымі ўменнямі: коратка расказваць пра сямейнае свята, запытваць, паведамляць інфармацыю асабістага характару з захаваннем элементарных норм маўленчага этыкету ў межах вывучанай тэматыкі, напісаць адрас, дату, падпісаць віншавальную паштоўку.

Метапрадметныя вынікі:

развіццё ўмення ўзаемадзейнічаць з педагагічным работнікам і аднакласнікамі, выконваючы розныя ролі ў межах праграмнай тэматыкі і маўленчых магчымасцей вучня;

развіццё камунікатыўных здольнасцей вучня, умення выбіраць адэкватныя моўныя і маўленчыя сродкі для паспяховага вырашэння камунікатыўнай задачы;

пашырэнне агульнага лінгвістычнага кругагляду;

развіццё пазнавальнай, эмацыянальнай і валявой сфер;

фарміраванне матывацыі да вывучэння замежнай мовы;

аваладанне ўменнем каардынаванай работы з рознымі кампанентамі вучэбна-метадычнага комплексу (падручнікам або вучэбным дапаможнікам, электронным дадаткам, практыкумам).

Асобасныя вынікі:

разуменне культурнай разнастайнасці свету;

фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый і ўстановак;

усведамленне сябе грамадзянінам сваёй краіны;

усведамленне ролі мовы, роднай і замежнай, як асноўнага сродку зносін паміж людзьмі;

знаёмства са светам замежных равеснікаў з выкарыстаннем сродкаў замежнай мовы (дзіцячая мастацкая літаратура, традыцыі);

наяўнасць цікавасці і жадання вывучаць замежную мову, усведамленне сябе моўнай асобай, здольнай і гатовай карыстацца замежнай мовай як сродкам зносін для правільнага і дакладнага выказвання думак у вуснай і пісьмовай формах;

засваенне культуры і этыкі маўленчых паводзін.

7. У якасці комплексных характарыстык, якія выказваюць змест задач, разглядаюцца кампетэнцыі, паколькі яны задаюць нормы і патрабаванні да валодання замежнай мовай, якія дазваляюць прасачыць ступень сукупнай рэалізацыі мэт і задач.

Міжкультурная кампетэнцыя – стратэгічная кампетэнцыя, валоданне якой заклікана забяспечваць асэнсаванне вучнямі іншай лінгвакультуры,

пазнанне імі сэнсавых арыенціраў іншага лінгвасоцыуму, уменні бачыць падабенства і адрозненні паміж культурамі і ўлічваць іх у працэсе іншамоўных зносін.

Камунікатыўная кампетэнцыя – валоданне сукупнасцю маўленчых, моўных, сацыякультурных норм вывучаемай мовы, а таксама кампенсаторнымі і вучэбна-пазнавальнымі ўменнямі, дазваляючымі вучню вырашаць маўленчыя, адукацыйныя, пазнавальныя і іншыя задачы, якія стаяць перад ім. У склад гэтай інтэгратыўнай кампетэнцыі ўваходзяць моўная, маўленчая, сацыякультурная, вучэбна-пазнавальная, кампенсаторная кампетэнцыі, якія разглядаюцца як субкампетэнцыі.

Моўная кампетэнцыя – сукупнасць моўных ведаў аб правілах функцыянавання моўных сродкаў (фанетычных, арфаграфічных, лексічных і граматычных) у маўленні і навыкаў іх выкарыстання з камунікатыўнымі мэтамі.

Маўленчая кампетэнцыя – сукупнасць навыкаў і ўменняў маўленчай дзейнасці (гаварэнне, успрыманне маўлення на слых, чытанне, пісьмо і пісьмовае маўленне), веданне норм маўленчых паводзін; набыццё на гэтай аснове досведу іх выкарыстання для пабудовы лагічнага і звязнага па форме і змесце выказвання, а таксама для тлумачэння сэнсу выказванняў іншых людзей.

Сацыякультурная кампетэнцыя – сукупнасць ведаў пра нацыянальна-культурную спецыфіку краін вывучаемай мовы, уменняў будаваць свае маўленчыя і немаўленчыя паводзіны ў адпаведнасці з гэтай спецыфікай, прадстаўляць на гэтай аснове сваю краіну і яе культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін.

Вучэбна-пазнавальная кампетэнцыя – сукупнасць агульных і спецыяльных вучэбных уменняў, неабходных для ажыццяўлення самастойнай дзейнасці па авалоданні замежнай мовай, вопыт іх выкарыстання.

Кампенсаторная кампетэнцыя – сукупнасць уменняў выкарыстоўваць дадатковыя вербальныя сродкі і невербальныя спосабы для вырашэння камунікатыўных задач ва ўмовах дэфіцыту наяўных моўных сродкаў.

Паслядоўнае і ўзаемазвязанае авалоданне пазначанымі ключавымі кампетэнцыямі забяспечвае фарміраванне ў вучняў адпаведных кампетэнтнасцей.

# ГЛАВА 2
# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў III КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ
105 гадзін

| Сфера зносін | Прадметна-тэматычны змест | Камунікатыўныя задачы<br>К канцу навучальнага года вучань павінен умець |
|---|---|---|
| Сацыяльна-бытавая | Я і мая сям'я | Прывітацца, развітацца, пазнаёміцца;<br>паведаміць асабістую інфармацыю (імя, прозвішча, узрост, месца жыхарства: краіна, горад або вёска);<br>расказаць пра бліжэйшых сваякоў (імя, месца жыхарства);<br>распытаць субяседніка аб членах яго сям'і |
| | Знешнасць | Апісаць знешнасць чалавека (асноўныя часткі цела, колер валасоў, колер вачэй, рост);<br>апісаць знешнасць членаў сям'і;<br>расказаць пра знешнасць сябра |
| | Прадукты харчавання | Назваць прадукты харчавання;<br>расказаць пра свае смакавыя перавагі;<br>распытаць пра смакавыя перавагі субяседніка;<br>прапанаваць пачастунак;<br>прыняць (адхіліць) прапанову;<br>падзякаваць |
| | Мой пакой. Класны пакой | Назваць асноўныя прадметы мэблі ў пакоі, класе;<br>распытаць пра асноўныя прадметы мэблі ў пакоі, класе;<br>расказаць пра размяшчэнне прадметаў у пакоі, класе;<br>апісаць сваё працоўнае месца ў класе;<br>папрасіць прабачэння за спазненне на ўрок;<br>папрасіць дазволу ўвайсці (выйсці) |
| | Жывёлы | Назваць і апісаць жывёл (афарбоўка, велічыня, харчаванне);<br>расказаць, што жывёла ўмее рабіць;<br>распытаць субяседніка пра яго любімую жывёлу;<br>выказаць свае адносіны да жывёл |
| Вучэбна-працоўная | Школьныя прылады | Паведаміць пра наяўнасць (адсутнасць) школьных прылад, іх месцазнаходжанне;<br>назваць асноўныя віды дзейнасці на ўроку;<br>ветліва папрасіць (прапанаваць) школьныя прылады (ручку, аловак, кнігу і гэтак далей.) |

| | | |
|---|---|---|
| Сацыяльна-пазнавальная | Поры года | Назваць і апісаць поры года;<br>расказаць пра любімую пару года;<br>распытаць субяседнік пра яго любімую пару года;<br>расказаць пра надвор’е |

Патрабаванні да практычнага валодання відамі маўленчай дзейнасці

Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны разумець на слых указанні педагагічнага работніка, звязаныя з вядзеннем урока, іншамоўныя тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, пабудаваныя на вывучаным моўным матэрыяле, у прад’яўленні педагагічнага работніка і ў гуказапісе, у тэмпе, набліжаным да натуральнага, з візуальнай апорай.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, песня.

Працягласць гучання тэксту: 0,5 мінуты.

Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець запытваць і паведамляць інфармацыю асабістага характару з захаваннем элементарных норм маўленчага этыкету.

Віды дыялогу: этыкетны дыялог, дыялог-распытванне.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка: 3.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

паведамляць інфармацыю ў межах вывучанага моўнага матэрыялу;

апісваць прадметы.

Віды маналагічнага выказвання: паведамленне, апісанне.

Аб’ём выказвання: не менш за 4 фразы.

Чытанне

Вучні павінны:

ведаць літары алфавіта і асноўныя гука-літарныя адпаведнасці;

умець чытаць услых і самі сабе тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, пабудаваныя на вывучаным моўным матэрыяле.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, скорагаворка, загадка, песня.

Аб’ём тэксту: прыкладна 750 друкаваных знакаў з прабеламі.

Пісьмо і пісьмовае маўленне

Вучні павінны ўмець:

пісаць усе літары алфавіта;

пісаць словы і сказы з апорай на ўзор;

пісаць сваё імя, прозвішча, дату;

падпісваць сшытак па ўзоры.

Патрабаванні да авалодання моўным матэрыялам

Англійская мова

Фанетыка

Гукі англійскай мовы, даўжыня і кароткасць галосных гукаў. Адсутнасць аглушэння звонкіх зычных. Рэдукцыя гукаў у ненаціскных складах. Інтанацыя формул маўленчага этыкету.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 50 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфікс лічэбнікаў -teen.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: утварэнне множнага ліку назоўнікаў з дапамогай канчаткаў -s, -es.

Артыкль: формы неазначальнага артыкля a (an), азначальны артыкль the.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 1–20.

Займеннік: асабовыя займеннікі; прыналежныя займеннікі ў адзіночным ліку.

Дзеяслоў: сцвярджальная і адмоўная формы дзеясловаў to be, to have ў Present Simple.

Загадны лад у сцвярджальных і адмоўных сказах.

Мадальны дзеяслоў can для выражэння магчымасці, здольнасці выконваць дзеянні.

Прыназоўнік: прыназоўнікі месца in, on, under.

Злучнік: and.

Сінтаксіс

Месца прыметніка ў сказе.

Простыя апавядальныя і пытальныя сказы з дзеясловамі to be, to have ў Present Simple.

Сказы з аднароднымі членамі.

Безасабовыя сказы з фармальным дзейнікам it (It’s warm. It’s spring.).

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

Марфалогія

Займеннік: прыналежныя займеннікі ў множным ліку.

Нямецкая мова

Фанетыка

Гукі нямецкай мовы, іх літарная адпаведнасць; даўжыня і кароткасць галосных, палаталізацыя і прыдыханне. Аглушэнне зычных у канцы склада, слова. Цвёрды прыступ. Націск у складаных словах. Інтанацыя простага апавядальнага сказа. Інтанацыя пытальных сказаў з пытальным словам і без пытальнага слова. Інтанацыя формул маўленчага этыкету.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 50 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: назоўнік + назоўнік; лічэбнік + лічэбнік.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: род назоўнікаў (біялагічны род). Назоўнік у назоўным і вінавальным склонах.

Артыкль: азначальны артыкль der, die, das; ужыванне азначальнага артыкля перад назвамі пор года і месяцаў.

Неазначальны артыкль ein, eine; ужыванне неазначальнага артыкля ў структуры «дзеяслоў sein + назоўнік».

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 1–20; 10–100 (лічэнне дзясяткамі).

Займеннік: асабовыя займеннікі ў назоўным склоне. Прыналежныя займеннікі mein, dein, sein, ihr у назоўным склоне.

Дзеяслоў: паўназначныя дзеясловы; дзеяслоў sein у цяперашнім часе Präsens Aktiv.

Мадальны дзеяслоў können для выражэння магчымасці; мадальны дзеяслоў wollen для выказвання жадання.

Сінтаксіс

Просты апавядальны сказ: прамы і адваротны парадак слоў.

Парадак слоў у сказе з мадальным дзеясловам і інфінітывам.

Безасабовыя сказы (Es ist kalt. Es regnet. Es ist Winter.).

Пабуджальныя сказы (Gib mir bitte…! Nimm bitte…!).

Пытальныя сказы з пытальным словам і без пытальнага слова.

Ужыванне адмаўлення nicht у простых сказах.

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

Займеннік: прыналежныя займеннікі ihr, unser, euer у назоўным склоне.

Французская мова

Фанетыка

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: род і лік назоўнікаў.

Артыкль: азначальны, неазначальны, частковы (з назвамі прадуктаў харчавання).

Прыметнік: род і лік прыметнікаў, прыналежныя прыметнікі mon (ma), mes, ton (ta), tes, son (sa), ses. Пытальныя прыметнікі quel(s), quelle(s).

Займеннік: асабовыя займеннікі ў ролі дзейніка (акрамя on). Пытальныя займеннікі qui, qu’est-ce que; націскныя займеннікі moi, toi.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 1–20.

Дзеяслоў: цяперашні час дзеясловаў avoir, être.

Прыслоўе: пытальныя прыслоўі comment, quand, combien, où.

Прыназоўнік: прыназоўнікі à, de, avec, sur, sous, dans.

Злучнік: et.

Сінтаксіс

Пабуджальныя сказы (Donne-moi…, s’il te plaît! Prends…, s’il te plaît!).

Парадак слоў у апавядальным і пабуджальным сказах.

Парадак слоў у пытальным сказе, пабудаваным з дапамогай інтанацыі, пытальнага звароту est-ce que.

Канструкцыі c’est... (ce sont...) .

Безасабовыя звароты il y a, il fait.

Адмоўная форма апавядальнага сказа (ne ... pas).

## Іспанская мова

### Фанетыка

Гукі іспанскай мовы. Націск у слове. Адсутнасць змякчэння цвёрдых зычных перад e, i. Інтанацыя сцвярджальных і адмоўных апавядальных сказаў. Інтанацыя пытальных сказаў з пытальным словам і без пытальнага слова.

### Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 50 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфікс -ito(a).

### Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: род і лік назоўнікаў.

Артыкль: неазначальны артыкль мужчынскага і жаночага роду, нулявы артыкль, зліццё артыкля з прыназоўнікамі de, a.

Прыметнік: звычайная ступень; род і лік прыметнікаў; дапасаванне прыметнікаў да назоўнікаў.

Займеннік: асабовыя займеннікі ў ролі дзейніка; прыналежныя займеннікі (кароткая форма); пытальныя займеннікі ¿qué?, ¿quién?, ¿quiénes?, ¿cuánto(s)?, ¿cuánta(s)?

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 1–50.

Прыслоўе: mucho, poco, muy, bien, mal; пытальныя прыслоўі ¿dónde?, ¿cómo?

Дзеяслоў: спражэнне правільных дзеясловаў і няправільных дзеясловаў (estar, ser, ir, tener, saber, poder, querer) у presente de indicativo. Дзеяслоўныя канструкцыі saber + infinitivo, poder + infinitivo, querer + infinitivo. Дзеяслоў gustar (me gusta(n), te gusta(n), le gusta(n), nos gusta(n), os gusta(n), les gusta(n)).

Безасабовая канструкцыя hay + назоўнік.

Прыназоўнік: прыназоўнікі de, con, sin, para, en; прыназоўнікі і прыназоўныя звароты месца en, entre, sobre, bajo (debajo de), delante de, detrás de, cerca de, lejos de.

Злучнік: y.

Сінтаксіс

Безасабовыя сказы (Hace frío (calor). Hace mal (buen) tiempo. Hace sol. Hace viento. Nieva. Llueve.).

## Кітайская мова

### Патрабаванні да практычнага валодання відамі маўленчай дзейнасці

### Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны разумець на слых указанні педагагічнага работніка, звязаныя з вядзеннем урока, іншамоўныя тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, пабудаваныя на вывучаным моўным матэрыяле, у прад'яўленні педагагічнага работніка і ў гуказапісе, у тэмпе, набліжаным да натуральнага, з візуальнай апорай.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, песня.

Працягласць гучання тэксту: 0,5 мінуты.

### Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець запытваць і паведамляць інфармацыю асабістага характару з захаваннем норм маўленчага этыкету.

Віды дыялогу: этыкетны дыялог, дыялог-распытванне.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка: 3.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

паведамляць інфармацыю ў межах вывучанага моўнага матэрыялу;

апісваць прадметы.

Віды маналагічнага выказвання: паведамленне, апісанне.

Аб’ём выказвання: не менш за 4 фразы.

Чытанне

Вучні павінны:

ведаць знакі транскрыпцыі;

умець суадносіць іерогліф з транскрыпцыйным знакам і малюнкам, які абазначае канкрэтныя прадметы і дзеянні;

чытаць услых і самі сабе кароткія тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару (4–5 сказаў), пабудаваныя на вывучаным моўным матэрыяле, напісаныя з дапамогай транскрыпцыйных знакаў.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, скорагаворка, загадка, песня.

Пісьмо і пісьмовае маўленне

Вучні павінны ўмець:

пісаць усе транскрыпцыйныя знакі, выкарыстоўваючы паўдрукаваны шрыфт;

пісаць словы і сказы ў транскрыпцыі з апорай на ўзор;

пісаць самыя простыя элементы іерогліфа (рысы) і іерогліфы па ўзоры (20 адзінак);

пісаць рысы ў правільным парадку.

Патрабаванні да авалодання моўным матэрыялам

Фанетыка

Гукі і тоны кітайскай мовы.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 50 лексічных адзінак.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: адзіночны і множны лік.

Лічыльнае слова: 个，只，本，岁，快，支，把，双，位，条.

Займеннік: асабовыя займеннікі 我，你，他，她，它，我们，你们，他们; указальныя займеннікі 这，那.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 1–20; лічэбнікі 二 і 两.

Дзеяслоў: маўленчыя структуры з найбольш частотнымі дзеясловамі; загадны лад.

Прыслоўе: 都，也.

Часціца: структурная часціца 的; адмоўныя часціцы 不，没.

Паслялог: паслялогі месца 里面，上面，下面，前面，后面，中间，旁边.

Прыназоўнік: 在

Сінтаксіс

Просты сказ са злучальным злучнікам 和.

Пытальныя сказы з часціцамі 吗，呢; з пытальнымі словамі 在哪里，谁，怎么样，什么，几.

Простыя апавядальныя сказы з дзеясловамі 是，有.

Сказы з дзеясловам 喜欢.

# ГЛАВА 3
# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IV КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ
105 гадзін

| Сфера зносін | Прадметна-тэматычны змест | Камунікатыўныя задачы<br>К канцу навучальнага года вучань павінен умець |
|---|---|---|
| Сацыяльна-бытавая | Сям'я і сябры | Расказаць пра роднасныя адносіны ў сям'і;<br>распытаць пра роднасныя адносіны ў сям'і;<br>расказаць аб прафесіях, інтарэсах і любімых занятках членаў сваёй сям'і і сям'і сябра;<br>распытаць аб прафесіях, інтарэсах і любімых занятках членаў сваёй сям'і і сям'і сябра;<br>апісаць члена сям'і або сябра (знешнасць, рысы характару) |
| | Дом і кватэра | Паведаміць пра месца жыхарства (горад або вёска, вуліца, дом, кватэра);<br>апісаць кватэру або дом (назва і колькасць пакояў);<br>расказаць пра свой пакой (асноўныя прадметы мэблі і іх месцазнаходжанне);<br>распытаць субяседніка пра яго пакой |
| | Распарадак дня | Спытаць і назваць час;<br>расказаць пра распарадак дня;<br>распытаць свайго субяседніка пра яго распарадак дня |
| | Адзенне | Апісаць прадметы адзення;<br>расказаць пра адзенне, якое носяць у розныя поры года;<br>спытаць цану на прадметы адзення;<br>назваць кошт прадметаў адзення;<br>папрасіць у краме адзенне пэўнага колеру і памеру |
| Вучэбна-працоўная | Расклад урокаў | Расказаць пра свой школьны расклад;<br>распытаць субяседніка пра яго школьны расклад;<br>расказаць пра свае ўрокі ў школе;<br>выказаць адносіны да вучэбных прадметаў; |

| | | |
|---|---|---|
| | | назваць асноўныя вучэбныя дзеянні (пісаць, чытаць, лічыць і гэтак далей) |
| Сацыяльна-культурная | Святы | Спытаць пра дату нараджэння;<br>назваць дату нараджэння;<br>павіншаваць са святам (з днём нараджэння, Новым годам);<br>падарыць (ветліва прыняць) падарунак;<br>расказаць пра святкаванне дня нараджэння;<br>распытаць пра святкаванне дня нараджэння;<br>выказаць свае адносіны да свят |
| | Выхадны дзень | Расказаць пра заняткі ў выхадны дзень;<br>распытаць пра заняткі ў выхадны дзень;<br>прапанаваць разам правесці вольны час;<br>прыняць (адхіліць) прапанову;<br>апісаць выхадны дзень аднаго з членаў сям'і |

Патрабаванні да практычнага валодання відамі маўленчай дзейнасці

Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны разумець на слых указанні педагагічнага работніка, звязаныя з вядзеннем урока, іншамоўныя тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, пабудаваныя на вывучаным моўным матэрыяле, у прад'яўленні педагагічнага работніка і ў гуказапісе, у тэмпе, набліжаным да натуральнага, з візуальнай апорай.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, песня, дыялог.

Працягласць гучання тэксту: 1 мінута.

Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець запытваць і паведамляць інфармацыю асабістага характару.

Віды дыялогу: этыкетны дыялог, дыялог-распытванне, дыялог-пабуджэнне да дзеяння.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка: 4.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

паведамляць інфармацыю ў межах вывучанага моўнага матэрыялу;

апісваць людзей і прадметы;

расказваць аб паслядоўнасці дзеянняў, падзей.

Віды маналагічнага выказвання: паведамленне, апісанне, апавяданне.

Аб'ём выказвання: не менш за 5 фраз.

Чытанне

Вучні павінны чытаць услых і самі сабе з поўным разуменнем, з правільным дзяленнем на сэнсавыя групы тэксты, пабудаваныя на вывучаным матэрыяле.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, песня, скорагаворка, загадка.

Аб’ём тэксту: прыкладна 900 друкаваных знакаў з прабеламі.

Пісьмо і пісьмовае маўленне

Вучні павінны авалодаць арфаграфіяй слоў, якія ўваходзяць у лексічны мінімум для дадзенага класа, і ўмець:

напісаць свой адрас;

падпісаць віншавальную паштоўку;

пісаць тэкст з апорай на ўзор.

Аб’ём тэксту: не менш за 20 слоў.

Патрабаванні да авалодання моўным матэрыялам

Англійская мова

Фанетыка

Сістэма транскрыпцыйных знакаў.

Націск у словах. Рытм англійскага маўлення. Інтанацыя сцвярджальных, адмоўных і пытальных сказаў. Інтанацыя формул маўленчага этыкету.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 70 лексічных адзінак.

Агульны аб’ём прадуктыўнай лексікі: 400 лексічных адзінак.

Агульны аб’ём рэцэптыўнай лексікі: 120 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфіксы лічэбнікаў -th, -ty; суфіксы назоўнікаў -er, -or.

Паказальнікі часу every day, in the morning, in the afternoon, in the evening.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: прыналежны склон назоўнікаў у адзіночным і множным ліку.

Артыкль: неазначальны артыкль перад назоўнікам у функцыі дапаўнення, перад назоўнікам пасля дзеяслова to be.

Азначальны артыкль перад парадкавымі лічэбнікамі. Адсутнасць артыкля перад назвамі вучэбных прадметаў. Адсутнасць артыкля перад прыметнікамі, ва ўстойлівых словазлучэннях (go to bed, have dinner).

Прыметнік: утварэнне вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання з дапамогай суфіксаў -er, -est і прыслоўяў more, the most.

Займеннік: указальныя займеннікі; прыналежныя займеннікі ў множным ліку.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 21–100; парадкавыя лічэбнікі 1–100.

Дзеяслоў: сцвярджальная, адмоўная і пытальная формы дзеясловаў у Present Simple, Present Continuous.

Мадальныя дзеясловы: can для выказвання просьбы; may для выражэння дазволу.

Прыслоўе: usually, tomorrow, tonight, then, upstairs, downstairs.

Прыназоўнік: прыназоўнікі with, for (breakfast); прыназоўнікі часу at (one o’clock), on (the first of January), in (the morning); прыназоўнік месца near.

Злучнік: but.

Сінтаксіс

Сцвярджальныя, адмоўныя і пытальныя сказы са зваротамі there is (there are), to be going to.

## Нямецкая мова

### Фанетыка

Націск у складаных словах. Адсутнасць націску на службовых словах. Інтанацыя простых развітых сказаў.

### Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 70 лексічных адзінак.

Агульны аб’ём прадуктыўнай лексікі: 400 лексічных адзінак.

Агульны аб’ём рэцэптыўнай лексікі: 120 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфіксы назоўнікаў, якія абазначаюць прафесіі: -er, -in; назоўнік + назоўнік; назоўнік + прыметнік; лічэбнік + лічэбнік.

### Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: назоўнікі жаночага, ніякага і мужчынскага роду ў давальным склоне.

Артыкль: неазначальны артыкль перад назоўнікам пры першым згадванні прадмета ці асобы; пасля дзеясловаў haben, brauchen.

Азначальны артыкль перад назоўнікам, які раней згадваўся ў кантэксце; перад парадкавым лічэбнікам.

Адсутнасць артыкля перад назоўнікам, які абазначае прафесію, род заняткаў у структурах «дзеяслоў sein + назоўнік»; перад назоўнікам у множным ліку, калі ён у адзіночным ліку ўжываецца з неазначальным артыклем.

Займеннік: прыналежныя займеннікі ihr, unser, euer у назоўным склоне; асабовыя і прыналежныя займеннікі ў давальным і вінавальным склонах; адмоўны займеннік kein (keine) перад назоўнікам.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 21–100; парадкавыя лічэбнікі 1–100.

Прыназоўнік: прыназоўнікі месца in, an, auf, якія патрабуюць вінавальнага або давальнага склону; прыназоўнікі часу in, an, якія патрабуюць давальнага склону.

Дзеяслоў: моцныя дзеясловы з каранёвымі галоснымі e, a і дыфтонгам au ў цяперашнім часе; дзеяслоў haben у цяперашнім часе Präsens Aktiv.

Мадальны дзеяслоў müssen у цяперашнім часе Präsens Aktiv для выражэння неабходнасці. Мадальны дзеяслоў mögen у цяперашнім часе Präsens Aktiv у значэнні «любіць», «падабацца» (у тым ліку пра ежу).

Сінтаксіс

Ужыванне doch у сцвярджальным адказе на пытанне з адмаўленнем. Парадак слоў у сказах з акалічнасцю месца і часу.

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

Марфалогія

Займеннік: неазначальна-асабовы займеннік man.

## Французская мова

### Фанетыка

Адрозненне на слых і дакладнае вымаўленне ўсіх гукаў французскай мовы. Счапленне і звязванне. Інтанацыйная мадэль апавядальнага (сцвярджальнага і адмоўнага), пабуджальнага і пытальнага сказаў. Інтанацыя формул маўленчага этыкету.

### Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 70 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 400 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 120 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфіксы назоўнікаў -ier, -ière; прыметнікаў -eur (-euse), -eux (-euse); лічэбнікаў -ier, -ière, -ième.

### Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: род і лік назоўнікаў, назоўнікі мужчынскага і жаночага роду, якія абазначаюць прафесію.

Артыкль: азначальны, неазначальны і частковы артыклі; злітныя артыклі au, aux, du, des; ужыванне азначальнага артыкля перад парадкавымі лічэбнікамі і ў датах.

Прыметнік: якасныя прыметнікі ў звычайнай ступені; прыналежныя прыметнікі notre (nos), votre (vos), leur (leurs); указальныя прыметнікі ce, cet, cette, ces.

Займеннік: націскныя займеннікі lui, elle, nous, vous, eux, elles.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 21–100; парадкавыя лічэбнікі 1–100.

Дзеяслоў: цяперашні час le présent дзеясловаў I групы і некаторых дзеясловаў III групы: aller, faire, lire, écrire, зваротныя дзеясловы se réveiller, se lever, se laver, se coucher, se reposer у le présent.

Прыслоўе: прыслоўі часу souvent, parfois, toujours, jamais.

Прыназоўнік: прыназоўнікі месца entre, devant, derrière, à droite, à gauche, au milieu de, en face de, près de і часу à, de ... à, en automne, en été, en hiver, au printemps. Адсутнасць прыназоўніка ў выразах ce matin, cet après-midi, ce soir.

Злучнік: mais.

Сінтаксіс

Агульнае і спецыяльнае пытанні да апавядальнага сказа са зваротам est-ce que.

Безасабовыя сказы. Безасабовы зварот il est.

## Іспанская мова

### Фанетыка

Інтанацыя сказаў з аднароднымі членамі, складаназлучаных сказаў са злучнікамі y, pero. Інтанацыя складаназалежных сказаў. Інтанацыя альтэрнатыўнага пытання.

### Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 70 лексічных адзінак.

Агульны аб’ём прадуктыўнай лексікі: 400 лексічных адзінак.

Агульны аб’ём рэцэптыўнай лексікі: 120 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфіксы назоўнікаў -ero(a), -dor(a), -tor(a).

### Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Артыкль: адсутнасць артыкля перад назоўнікамі, якія абазначаюць прафесію.

Прыметнік: дапасаванне прыметнікаў да назоўнікаў; ступені параўнання прыметнікаў grado comparativo, grado superlativo.

Займеннік: указальныя займеннікі-прыметнікі este (esta), ese (esa), aquel (aquella); estos(-as), esos(-as), aquellos(-as).

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 50–100; парадкавыя лічэбнікі 1–12.

Дзеяслоў: пранамінальныя (займенныя) дзеясловы; сістэма спражэння правільных і няправільных дзеясловаў у presente de indicativo. Futuro inmediato (ir a + infinitivo).

Канструкцыі неабходнасці: tener que + infinitivo, deber + infinitivo, hay que + infinitivo.

Канструкцыі: antes de + infinitivo, después de + infinitivo.

Прыслоўе: прыслоўі también, tampoco, cerca, lejos, rápido; пытальныя прыслоўі ¿adónde?, ¿cuándo?

Ступені параўнання прыслоўяў grado comparativo, grado superlativo.

Прыназоўнік: прыназоўнікі часу a, en, прыназоўнік напрамку a.

Прыназоўнік a з назоўнікамі ў вінавальным і давальным склонах, з дзеясловамі для абазначэння напрамку руху.

Сінтаксіс

Альтэрнатыўнае пытанне.

Складаназлучаныя сказы са злучнікамі pero, y.

Складаназалежныя сказы са злучнікам cuando.

Кітайская мова

Патрабаванні да практычнага валодання відамі маўленчай дзейнасці

Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны разумець на слых указанні педагагічнага работніка, звязаныя з вядзеннем урока, іншамоўныя тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, пабудаваныя на вывучаным моўным матэрыяле, у прад'яўленні педагагічнага работніка і гуказапісе, у тэмпе, набліжаным да натуральнага, з візуальнай апорай.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, песня, дыялог.

Працягласць гучання тэксту: 0,5 мінуты.

Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець запытваць і паведамляць інфармацыю асабістага характару з захаваннем норм маўленчага этыкету.

Віды дыялогу: этыкетны дыялог, дыялог-распытванне, дыялог-пабуджэнне да дзеяння.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка: 4.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

паведамляць інфармацыю ў межах вывучанага моўнага матэрыялу;

апісваць людзей і прадметы;

расказваць аб паслядоўнасці дзеянняў, падзей.

Віды маналагічнага выказвання: паведамленне, апісанне, апавяданне.

Аб'ём выказвання: не менш за 5 фраз.

Чытанне

Вучні павінны ўмець:

чытаць услых і самі сабе з поўным разуменнем, з правільным дзяленнем на сэнсавыя групы тэксты, пабудаваныя на вывучаным матэрыяле і напісаныя з дапамогай транскрыпцыйных знакаў;

чытаць іерогліфы, якія ўваходзяць у актыўны мінімум; суадносіць іерогліф з транскрыпцыйным знакам і малюнкам, які абазначае канкрэтныя прадметы і дзеянні.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, песня, коміксы, скорагаворка, загадка.

Аб'ём тэксту: 0,3 старонкі.

Пісьмо і пісьмовае маўленне

Вучні павінны ўмець:

валодаць арфаграфіяй слоў, якія напісаны ў транскрыпцыі і ўваходзяць у лексічны мінімум для дадзенага класа;

пісаць іерогліфы з апорай на ўзор – 60 адзінак.

Патрабаванні да авалодання моўным матэрыялам

Фанетыка

Націск у словах.

Дысіміляцыя трэцяга тону.

Інтанацыя апавядальных сказаў.

Інтанацыя агульных і спецыяльных пытанняў.

Інтанацыя формул маўленчага этыкету.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 70 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 400 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 120 лексічных адзінак.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Прыметнік: ступені параўнання прыметнікаў: …比…好; 他最高.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі да 50.

Займеннік: асабовыя займеннікі 咱们; прыналежныя займеннікі 我的, 你的, 他的, 她的, 它的, 我们的, 你们的, 他们的, 她们的.

Дзеяслоў: прошлы час (了): 昨天…打球了; будучы час 明天…放风筝.

Мадальны дзеяслоў: 要, 会.

Лічыльныя словы: 盘, 碗, 杯, 瓶, 盒, 套, 间, 台, 张, 件.

Прыслоўе: 已经.

Злучнік: 还是，或者.

Сінтаксіс

Парадак слоў у простым сказе.

Агульныя і спецыяльныя пытанні.

Пабуджальныя сказы з часціцай 吧 (… 一 起 … 吧 ！ ), 我们一起玩儿吧！- 好（太好了！），吃点儿蛋糕吧！ Загадная канструкцыя 走吧!

Часавая канструкцыя 的时候.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў пасля заканчэння навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі

Ведаць:

транскрыпцыйныя знакі вывучаемай мовы;

рытм, правілы націску ў словах; асаблівасці інтанацыі сцвярджальных, адмоўных і пытальных сказаў, формул маўленчага этыкету;

лексічныя адзінкі і граматычныя з’явы прадуктыўнага і рэцэптыўнага мінімумаў;

асноўныя камунікатыўна значныя маўленчыя ўзоры, неабходныя для авалодання на элементарным узроўні вусным і пісьмовым маўленнем на замежнай мове;

элементарныя звесткі аб нацыянальна-культурных асаблівасцях краін вывучаемай мовы, элементарныя нормы маўленчага этыкету, асобныя рыфмаваныя творы дзіцячага фальклору краіны вывучаемай мовы, даступныя па змесце і форме;

прыёмы ажыццяўлення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці па авалоданні замежнай мовай;

элементарныя вербальныя (родная мова) і невербальныя сродкі пераадолення цяжкасцей пры зносінах (міміка, жэсты, малюнак);

умець:

запытваць, паведамляць інфармацыю асабістага характару з захаваннем элементарных норм маўленчага этыкету ў ходзе рэалізацыі этыкетнага дыялогу, дыялогу-распытвання, дыялогу – пабуджэння да дзеяння і маналогу-паведамлення, маналогу-апавядання, а таксама апісваць прадметы (маналог-апісанне);

разумець на слых указанні педагагічнага работніка, звязаныя з вядзеннем урока, іншамоўныя тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару (казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, дзіцячая песня), пабудаваныя на вывучаным моўным матэрыяле, у прад’яўленні педагагічнага работніка або ў гуказапісе (працягласць гучання: 0,5–1 мінута), у тэмпе, набліжаным да натуральнага, з візуальнай апорай;

чытаць услых і самі сабе з поўным разуменнем, з правільным дзяленнем на сэнсавыя групы тэксты аб’ёмам прыкладна 900 друкаваных знакаў з прабеламі (кітайская мова – 0,3 старонкі), пабудаваныя на вывучаным матэрыяле (казка, апавяданне, дыялог, верш, песня, рыфмоўка);

пісаць нескладаныя віды тэкстаў з апорай на ўзор у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ў краіне вывучаемай мовы (аб'ём тэксту – не менш за 20 слоў ці 30–40 іерогліфаў);

выкарыстоўваць элементарныя вербальныя (родная мова) і невербальныя сродкі пераадолення цяжкасцей пры зносінах (міміка, жэсты, малюнак);

ажыццяўляць элементарны аналіз моўных з'яў: гукаў, літар, літараспалучэнняў, слоў, словазлучэнняў і сказаў;

дзейнічаць па аналогіі (па ўзоры) пры вырашэнні камунікатыўных задач;

карыстацца слоўнікам у вучэбным дапаможніку (падручніку);

валодаць:

вуснымі і пісьмовымі відамі іншамоўнай маўленчай дзейнасці на элементарным узроўні з захаваннем сацыякультурных норм;

фанетычнымі, лексічнымі, граматычнымі і арфаграфічнымі нормамі вывучаемай замежнай мовы для вырашэння камунікатыўных задач на элементарным узроўні;

прыёмамі ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці;

элементарнымі вербальнымі (родная мова) і невербальнымі сродкамі пераадолення цяжкасцей пры зносінах (міміка, жэсты, малюнак).